**ДУА «Грынкаўскі дзіцячы сад – базавая школа Свіслацкага раёна» Гродзенскай вобласці**

**Інфармацыйна-адукацыйны праект «ШАГ»**

**Тэма: «Гонар за Беларусь. Мір міжканфесійны, мір міжнацыянальны» (аб прыярытэтах канфесійнай палітыкі Рэспублікі Беларусь).**

27.01.2022 г. у Грынкаўскім дзіцячым садзе – базавай школе Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці прайшло чарговае мерапрыемства інфармацыйна-адукацыйнага праекта «ШАГ» на тэму «Гонар за Беларусь. Мір міжканфесійны, мір міжнацыянальны» (аб прыярытэтах канфесійнай палітыкі Рэспублікі Беларусь).



У ходзе ШАГа 1 «Мы пазнаем» вядучыя пазнаёмілі навучэнцаў са зместам інфармацыйных блокаў: «Прыярытэты канфесійнай палітыкі Рэспублікі Беларусь; “Храм-помнік у гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню Айчыны нашай, – месца духоўнага адзінства».

Было адзначана, што канфесійная палітыка Рэспублікі Беларусь накіравана на падтрыманне і ўмацаванне  міжканфесійнага міру, згоды ў беларускім грамадстве, развіццё ўзаемадзеяння з гістарычна традыцыйнымі канфесіямі. Была звернута ўвага на словы Прэзідэнта Рэспублікі Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, які зазначыў, што «самым галоўным дасягненнем з’яўляецца тое, што мы захавалі мір і спакой на нашай зямлі. Мір міжканфесійны і мір міжнацыянальны. Гэта тое, чым можа ганарыцца любая дзяржава. І, перш за ўсё, наша Беларусь».

Заканадаўства краіны забяспечвае і гарантуе правы кожнага на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, на сацыяльную роўнасць і абарону правоў і інтарэсаў грамадзян незалежна ад іх рэлігійнай прыналежнасці, на свабоду аб’яднання ў рэлігійныя згуртаванні.

Дзяржаўныя органы ў Беларусі на ўсіх узроўнях падтрымліваюць ініцыятывы рэлігійных аб’яднанняў, накіраваных на забеспячэнне дыялогу паміж канфесіямі на аснове павагі да правоў чалавека і рэлігійнай цярпімасці.



У той жа час вядзецца работа па прадухіленні дзейнасці дэструктыўных рэлігійных аб’яднанняў.

Класны кіраўнік IX класа Русак Наталля Рыгораўна нагадала вучням аб тым, што Канстытуцыя краіны і Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных аб’яднаннях»

устанаўліваюць роўнасць усіх рэлігій і веравызванняў перад законам. Удзельнікі ШАГа звярнуліся да 16 і 31 артыкулаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і да 4 і 5 артыкулаў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных аб'яднаннях» і прааналізавалі іх.

Класны кіраўнік VIII класа Барэль Сяргей Пятровіч у сваім выступленні адзначыў, што ў Беларусі дейнічаюць 3 563 зарэгістраваныя ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку рэлігійныя арганізацыі, 25 канфесій і накірункаў, у тым ліку 174 арганізацыі, якія маюць агульнаканфесійнае значэнне (рэлігійныя аб'яднанні, манастыры, брацтвы, духоўныя навучальныя ўстановы і інш), і 3 389 абшчын (праваслаўныя, рымска-каталіцкія, хрысціян веры евангельскай, евангельскіх хрысціян бапцістаў, лютэранскія, іўдзейскія, мусульманскія, абшчыны іншых рэлігійных напрамкаў).



Вядучае месца ў рэлігійным жыцці краіны займае Беларуская праваслаўная царква, якая аб'ядноўвае 15 епархій, 1 709 абшчын, 6 духоўных навучальных устаноў, 35 манастыроў, 15 брацтваў.



На сустрэчу з навучэнцамі быў запрошаны настаяцель храма Успення Прасвятой Багародзіцы аг. Дабраволя айцец Пётр, які пачаў сваю размову з гісторыі стварэння свету і чалавека і акцэнтаваў увагу на тым, што Бог стварыў чалавека свабодным і даў яму права выбару. Зазначыў, што Бог не пакідае нас, кіруе нашымі ўчынкамі, але, на жаль, мы не заўсёды падпарадкоўваемся законам сумлення. Шлях, якім ідзе чалавек да Госпада, не заўсёды лёгкі і ў кожнага свой. Таксама айцец Пётр расказаў навучэнцам аб разгалінаванні хрысціянскага дрэва на розныя канфесіі, патлумачыў сутнасць паняцця праваслаўная вера: правая і слаўная, раскрыў сутнасць святаў Раства і Хрышчэння, а таксама расказаў аб змесце Біблії: што апісваецца ў Старым і Новым запаветах. Напрыканцы гутаркі навучэнцы пацікавіліся новай пабудовай ля царквы ў аг. Дабраволя і даведаліся, што гэта ўзводзіцца званіца.





Падчас другога інфармацыйнага блока «Храм-помнік у гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню Айчыны нашай, – месца

духоўнага адзінства» быў прагледжаны відэаролік «Храм-памятник в честь Всех Святых Легендарная крипта и Музей памяти». Вядучыя расказалі пра гісторыю гэтага храма ад дня асвячэння закладного каменя храма-помніка ў Мінску ў 1991 годзе да цырымоніі адкрыцця помніка ў 2012 годзе. Была звернута ўвага на ўнікальны аб'ект – крыпту (капсулу з зямлёй, прывезенай з розных краін з захаванняў Другой сусветнай вайны) – як нацыянальную святыню, закладзеную 2 кастрычніка 2015 года.




Прыводзіліся ў якасці запавету словы настаяцеля Усіхсвяцкага храма пратаірэя Фёдара Поўнага, які зазначыў, што «храм-помнік не толькі ўпрыгожвае Мінск, але і з'яўляецца прыкладам мужнасці нашых продкаў, выхоўвае культуру памяці нашчадкаў. Тут кожны можа памаліцца свайму нябеснаму заступніку. Не скарыцца той народ, які захоўвае памяць пра сваіх герояў, помніць свой род і паважае Бога». Нездарма 2022 год у нашай краіне аб'яўлены Годам гістарычнай памяці.



Пад час ШАГа 2 «МЫ АБМЯРКОЎВАЕМ» было арганізавана абмеркаванне інфармацыі, атрыманай у ходзе ШАГа 1. Асаблівую цікавасць выклікала пытанне: Што вы ведаеце пра рэлігіі свету? Навучэнцы распавядалі пра цікавыя факты, вядомыя ім з урокаў гісторыі, мастацкіх твораў і кінафільмаў. Абмяркоўвалі ўнікальнасць рэлігійнай сітуацыі ў Беларусі. Выказвалі думкі аб тым, што павінна быць пакладзена ў аснову міжнацыянальных і міжрэлігійных адносін. Навучэнцы згадзіліся са словамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі: «Палітыка міжнацыянальнага і міжканфесійнага міру – брэнд Беларусі».

Пры абмеркаванні другога інфармацыйнага блока кожны навучэнец выказаўся і аргументаваў сваю думку аб тым, што для яго значыць паняцце "гістарычная памяць" і навошта яна патрэбна народу.

Настаяцель храма Успення Прасвятой Багародзіцы аг. Дабраволя айцец Пётр расказаў аб культавых пабудовах нашага раёна. Абмеркаваў з вучнямі правілы паводзін у храме.



У ходзе рэалізацыі ШАГа 3 «МЫ ДЗЕЙНІЧАЕМ» вядучыя падвялі вынікі, наколькі актуальная дадзеная тэма, наколькі важна і далей быць талерантнымі, умець разумець іншага чалавека з усімі яго асаблівасцямі, бо

талерантныя адносіны да другога – гэта шлях цікавых адкрыццяў самаго сябе. Неабходна беражліва захоўваць гістарычную памяць нашага народа праз ушанаванне яго культуры, бо гэта і ёсць шлях духоўнага росту і развіцця кожнага чалавека на планеце Зямля. На працягу мерапрыемства падкрэслівалася важнасць уплыву рэлігіі на фарміраванне духоўных, культурных і грамадскіх традыцый беларускага народа, на яго менталітэт.



У рамках рэалізацыі мерапрыемстваў Праграмы супрацоўніцтва паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай Праваслаўнай царквой на 2020 – 2025 гады было вырашана стварыць віртуальны экскурсійны маршрут па праваслаўных святынях Свіслацкага раёна. Члены клуба “Пошук” прапанавалі папоўніць школьны музей ільну новымі экспанатамі – лялькамі народаў і народнасцей, якія пражываюць у Беларусі.

Наталля Рыгораўна Русак,
класны кіраўнік IX класа Грынкаўскага дзіцячага сада – базавай школы Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці